Бароўка Л.В.
к.г.н.,дацэнт

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ПРАЦЫ МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ ВНУ У ФАРМІРАВАННІ АСОБЫ СПЕЦЫЯЛІСТА

Асобу спецыялІста, як І кожнага працаўнІка, характэрызуюць маральныя І прафесІйныя якасцІ. Яны, у першую чаргу, залежаць ад выбранай сферы працы ў адпаведнасцІ са сваІмІ Інтэрэсамі І здольнасцямІ, ад ступенІ уздзеяння на маладога чалавека станоўчых традыцый, якІя характэрызуюць маральна-псІхалагІчную атмасферу калектыва вну.

Неабходнасцю вырашэння названых праблем І вызначаецца роль музеяў гІсторыІ вну. Як адзначыў вялІкІ гІсторык старажытнасцІ Цыцэрон, гІсторыю пІшуць для таго, каб знаць праўду. КалІ кнІгІ знаемяць з гІсторыяй, як правІла, з дапамогай слоў, то музей — з дапамогай дакументаў. Значыць, выкананне музеем сваІх задач залежыць ад якасцІ яго экспазІцыІ. На яе ўплываюць многІя фактары: якасць памяшкання; аб'ем І якасць фондаў; мастацкае афармленне дэманстрацыйных залаў; тэхнІчная база; прафесІйны ўзровень супрацоўнІкаў музея; удзел членаў калектыву вну у фармІраваннІ фондаў І г.д.

На жаль, далека не ўсе супрацоўнІкІ кожнай вну ясна усведамляюць задачы, асаблІвасцІ працы музея, праяўляюць актыўнасць у фармІраваннІ фондаў, аказваюць дапамогу ў вырашэннІ другІх праблем. У выніку губляюцца, знІшчаюцца асобныя каштоўныя дакументы, абядняюцца экспазІцыІ музеяў. Уздзеянне музея на фармІраванне асобы спецыялІста ў значнай меры залежыць таксама ад часу правядзення экскурсІй.

Найбольшы эфект яны даюць для выпускных класаў школ (дапамагаюць вызначыцца у выбары спецыяльнасцІ І спецыялІзацыІ) І першакурснІкаў (знаемяць з асаблІвасцямІ працы вну, яе традыцыямІ, выхоўваюць пачуццІ патрыятызму І гонару за выбраную спецыяльнасць, даюць бачанне перспектыў сваёго роста).

Для другІх курсаў замест аглядальных экскурсІй рэкамендуецца праводзІць тэматычныя па асобным раздзелам. Напрыклад, гІсторыя развІцця навукІ вну, гІсторыя развІцця мІжнародных сувязей І г.д.

Пры наяўнасцІ адпаведных умоў (памяшкання І фондаў) станоўчы эфект на фармІраванне асобы будучага спецыялІста аказваюць тэматычныя выстаўкІ. Напрыклад, прысвечаная юбІлеям вучоных,былых выпускнІкоў, а потым супрацоўнІкаў вну.